# СТАГОДДЗЯ

## «Важны не вынік, а сам працэс»



**Вікторыя КОЎЧЫК — курсантка чацвёртага курса крымінальна-выканаўчага факультэта Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў.**

«Мой тата міліцыянер — для мяне прыклад. Ён хацеў, каб я працягнула дынастыю ў пагонах. Сама служба мяне таксама вабіла. Я па натуры рамантык, наглядзелася фільмаў аб праваахоўніках і захацела змагацца са злачыннасцю. Мары спраўджваюцца».

«Старанна вучылася ў школе, імкнулася паступіць у Акадэмію МУС. Дзяўчыне дастаткова цяжка трапіць сюды — высокі прахадны бал. У год майго паступлення ён складаў 346, у мяне быў 381. Я сярэбраны прызёр Рэспубліканскай алімпіяды па грамадазнаўстве».

«Спорт можа ратаваць ад дрэннага настрою, дапамагае забыцца на няўдачы. Спачатку фізічна мне было цяжка ў Акадэміі. Не прывыкла да такіх нагрузак. Але з часам настолькі палюбіла бег, трэнажорную залу, што сама здзіўляюся. Цікаўлюся таксама правільным харчаваннем».

«Прэзідэнцкую стыпендыю двойчы атрымлівала ў школе і ў Акадэміі. Па выніках 2018/2019 навучальнага года стала «Найлепшым курсантам». Мэты такой не ставіла, неяк само выйшла *(усміхаецца)*. Галоўнае — заўсёды нешта рабіць. Не сядзець на месцы, развівацца. Працаздольнасць і ўменне канцэнтравацца на галоўным — адны са складнікаў поспеху. Удача таксама патрэбна! Таму не крыўдзіце яе».

«Усе мае ўзнагароды ў асобнай папцы захоўвае тата. Ён вельмі беражліва ставіцца да падобных дакументаў. Любіць заслугі дачкі паказваць гасцям. Для мяне ж важны не вынік, а сам працэс».

«Спяваю, скончыла курсы па вакале. Шмат чытаю, хаджу ў тэатр. Граю на фартэпіяна. Займаюся навуковай дзейнасцю. Навука — важная частка майго жыцця. Творчасць — справа выключна для душы. Я рэальна гляджу на рэчы. Другой Селін Дыён мне наўрад ці стаць» *(усміхаецца)*.

«Мне падабаецца камунікаваць з людзьмі. З нецярпеннем чакаю першага рабочага дня. На здзіўленне многіх, планую паехаць у невялікі горад. Лічу, што менавіта там можна атрымаць бясцэнны прафесійны вопыт. Служыць буду ў структуры папраўчых устаноў».

«Дзяўчыне не месца ў міліцыі — састарэлы стэрэатып. Усё залежыць ад самога чалавека. Галоўнае, каб унутраныя задаткі дазвалялі і, вядома, было б жаданне. Я ведаю шмат жанчын, якія дабіліся вялікіх вынікаў па службе».

«Хацелася б, каб моладзь актыўней удзельнічала ў жыцці краіны. Іх ідэі, свежыя погляды, рашучасць і энтузіязм могуць многае! Добра, што дзяржава шмат увагі аддае рабоце з будучым пакаленнем, стварае неабходныя ўмовы для развіцця. Фінансавая падтрымка таксама важная».

«Каханне. Вось адно з маіх галоўных дасягненняў за дваццаць гадоў. Разважаю зараз выключна як дзяўчынка *(бянтэжыцца)*. У сучасным свеце цяжка знайсці свайго чалавека. Мне пашчасціла. Усё пачынаецца з сям'і. Будзе родны чалавек побач, будзе і работа, і кар'ера. Удваіх любыя горы скарыць можна! Упэўненая, усё самае цікавае яшчэ наперадзе».

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
**Фота з асабістага архіва гераіні.**

Насустрач будучыні

# РОМАВЫ МАРЫ ПРА РОБАТАЎ

**— Колькі сябе памятаю, заўсёды цягнула да праграмавання, — расказвае дваццацігадовы студэнт матэматычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны Раман МІСАЧЭНКА. Трэцякурснік вучыцца па спецыяльнасці «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання», прадстаўляе праекты на рэспубліканскім узроўні і жадае быць карысным сваёй краіне. Але пра ўсё па парадку.**



Яшчэ ў дзявятым класе, калі астатнія школьнікі сыходзілі пасля ўрокаў дадому, Рома «завісаў» у кабінеце інфарматыкі і паглыбляўся ў цікавы сусвет сімвалаў і лічбаў. Нават стварыў з аднакласнікам лакальную гульню...

— Аднак амбіцый для яе маштабавання не хапіла: адпачынак у бабулі аказаўся ў прыярытэце *(усміхаецца)*. Пазней, у дзясятым класе, стварыў анлайнавы складальнік тэстаў для настаўніка па матэматыцы, выступіў з ім на рэспубліканскім конкурсе «Камп'ютар. Адукацыя. Інтэрнэт». Тады і задумаўся ўсур'ёз над тым, каб стаць праграмістам, як старэйшы брат Ігар. Паступіў у ВНУ, адразу ж сабраў вакол сябе аднакурснікаў і сказаў: трэба ствараць нешта грандыёзнае. Спрачацца хлопцы не сталі, тым больш што ў мяне былі назапашаны пэўныя веды, каб падзяліцца імі з іншымі, — расказвае хлопец.

Сёлета разам з двума аднагрупнікамі Рома распрацаваў мабільны сэрвіс «Адукацыя».

— Лічу, што гэтая сфера — аснова развіцця нацыі, і добра, калі паняцце пра тое, што яна павінна змяшчаць і як выглядаць, трансфармуецца. У краіне ўжо выкарыстоўваюцца электронныя журналы і дзённікі, аднак наша прылада ўключае ў сябе штосьці большае: гэта і адзіны чат для абмеркавання розных тэм карыстальнікамі, і база адукацыйных навін горада (апавяшчэнні аб алімпіядах, конкурсах, канферэнцыях і іншым).

Зону адказнасці пры распрацоўцы праекта сябры падзялілі па магчымасцях і жаданні. Рома як аўтар займаўся большасцю працэсаў. Рэалізацыю пачалі ў рамках свайго факультэта. Зрабілі мабільныя версіі як на Android, так і на iOS, атрымалі станоўчыя водгукі ад студэнтаў і выкладчыкаў, а таксама пералік таго, што тым хацелася б дадаць. «Адукацыя» ўжо высока заявіла пра сябе на рэспубліканскім конкурсе «100 ідэй для Беларусі» і цяпер тэсціруецца ў адной з гомельскіх школ.

Нашаму герою ўдаецца быць лідарам па жыцці, падабаецца аб'ядноўваць кагосьці дзеля адной мэты і несці адказнасць за кожны свой крок.

— Пасля першага курса я пачаў зарабляць свае грошы, стаў незалежны ад бацькоў. Цяпер увесь вольны час імкнуся заняць чымсьці карысным, у асноўным ён сыходзіць на вывучэнне новых тэхналогій, моў праграмавання.

Дарэчы, сярод апошніх ідэй, якія плануе рэалізаваць у хуткім часе Рома, — аўтаматычны прыбіральшчык снегу. А галоўная мэта на найбліжэйшую будучыню — атрымаць месца ў паспяховай кампаніі ў якасці распрацоўшчыка робататэхнікі.

— Мяне цікавяць робаты, якія вызваляюць людзей ад руціннай працы або могуць рабіць нейкія цікавыя, незвычайныя рэчы. Напрыклад, ратаваць людзей або лётаць у космас. Трапіць у парк высокіх тэхналогій таксама крута. Увогуле адчуваю сябе ў сваім узросце выдатна. Ёсць шмат магчымасцяў, і ўсё хочацца паспрабаваць рэалізаваць. Спадзяюся, што рухаюся ў правільным кірунку. Мару пра тое, што праз дзесяць, дваццаць гадоў я абавязкова буду ствараць штосьці крэатыўнае. Хачу быць наватарам, хачу быць карысным роднай зямлі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**



# Узлятаць і перамагаць

Пра Карыну Дзямідзік аматары спорту даведаліся і ўжо паспелі палюбіць яе пад дзявочым прозвішчам — Таранда. Беларуская скакуха ў вышыню, якая нарадзілася ў Баранавічах, у літаральным сэнсе слова ўварвалася ў сусветную эліту лёгкай атлетыкі. За свае 20 гадоў яна паспела «засвяціцца» на сусветных і еўрапейскіх п'едэсталах і некалькі разоў абнаўляла асабістыя і нацыянальныя рэкорды ў скачках у вышыню ў юніёрскай, маладзёжнай і дарослай катэгорыях. А ў 2020 годзе спартсменку чакае першая ў жыцці Алімпіяда.

Спорт Карына палюбіла з самага дзяцінства, аднак знайшла сябе ў лёгкай атлетыцы не адразу, перад ёй паспрабаваўшы акрабатыку, плаванне і валейбол.

— Трэнер па лёгкай атлетыцы хадзіла за мной некалькі гадоў, усё запрашала да сябе, а я не згаджалася, — расказвае Карына. — Потым прыйшла сама. У нас з ёй было вельмі шмат рознагалоссяў, было цяжка, нават не ведаю, чаму я засталася ў спорце. Было такое, што мяне выганялі. Былі і сур'ёзныя праблемы са здароўем — урачы казалі, што, калі буду займацца далей, стану інвалідам. А я ўсё роўна працягнула: трэніравалася сама — тады не разумела, дзеля чаго, але трэніравалася.

Такая ўпартасць не толькі захавала дзяўчыне здароўе, але і хутка прынесла поспех. Спачатку Карына стала сярэбраным прызёрам чэмпіянату Еўропы сярод юніёраў, затым чэмпіёнкай свету сярод юніёраў. А далей адкрыла перад сабой дзверы ў дарослы вялікі спорт, стаўшы фіналісткай кантынентальнага чэмпіянату ў Берліне ў 2018 годзе, чэмпіянату Еўропы ў памяшканнях у Глазга ў 2019 годзе і маладзёжнага чэмпіянату Еўропы. Сёлета на этапе Брыльянтавай лігі ў Лазане 20-гадовая Карына стала сярэбраным прызёрам, паўтарыўшы пры гэтым рэкорд Беларусі сярод дарослых, устаноўлены ў далёкім 1993 годзе, — 2,00 м. Акрамя таго, выканаўшы алімпійскі нарматыў, Дзямідзік заваявала ліцэнзію ў Токіа-2020 — гэта будзе першая Алімпіяда для Карыны.

Трэнер скакухі Валянцін Курдзюк, які стаў для спартсменкі амаль бацькам, запэўнівае, што два метры — гэта не мяжа для яго падапечнай. «Не магу сказаць, што ў Карыны звышданыя ад прыроды, але яна добра сфарміраваная для скачкоў у вышыню і ў яе моцны характар. Карына вельмі прафесійна ставіцца да сваёй справы і цалкам дакладна ведае, да чаго імкнецца, таму дамагаецца выніку дзякуючы сплаву працавітасці і здольнасцяў».

Сама ж Карына адзначае, што вялікую ролю ў паспяховым выніку спартсмена адыгрывае псіхалогія.

— Чалавек сам не ведае, на што ён здольны. Яго магчымасці неабмежаваныя. Усе нашы абмежаванні — у галаве. Як ты псіхалагічна працуеш над сабой, як выхоўваеш свае думкі — так гэта адаб'ецца на тваіх поспехах у спорце.

Карына расказвае, што самае класнае ў яе відзе спорту — пачуццё палёту.

— Калі адрываешся ад зямлі, усё роўна як тэлепартуешся ў космас. А калі планка застаецца на месцы, то цябе ахопляе неверагоднае захапленне. Гэта цяжка апісаць, гэта трэба паспрабаваць.

Аднак наколькі б каштоўны ні быў для Карыны спорт, яна адзначае, што гэта не адзінае, на чым засяроджана яе ўвага.

— Я стаўлюся да яго як да работы і хобі, цяпер ім жыву, але не скажу, што спорт — сэнс майго жыцця. У мяне і сям'я прысутнічае — калі раптам я скончу са спортам ці ў мяне не атрымаецца, не буду пакутаваць, таму што ёсць зусім іншае жыццё.

Сёлета, акрамя спартыўных поспехаў, у жыцці Карыны адбылася яшчэ адна значная падзея — дзяўчына выйшла замуж. Яе выбраннік часта бывае на спаборніцтвах разам з Карынай і падтрымлівае ва ўсіх жыццёвых сітуацыях. «Я шчаслівая, што нашы дарогі перапляліся ў адзін шлях, і, ідучы па ім крок за крокам, я атрымліваю асалоду ад жыцця!» — піша спартсменка пад здымкам з мужам у сваіх сацыяльных сетках.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**